# БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND“ — Цана 30 н. фэн.

Nr. 41 (44) — 26 СЬНЕЖАНЯ 1948 Г. — ГОД ВЫДАНЬНЯ 2


# БЕЛАРУСАМ КАТАЛІКОМ - ВЯСЁЛЫХ КАЛЯД!

## ІЗНОЎ ВАЙНА

З Батавіі паведамілі, што галяндзкі ўрад распачаў новую «паліцыйную акцыю» супраць Інданэзыйскай рэспублікі. Галяндзкія аддзелы занялі найбольшае места Інданэзіі й сталіцу рэспубліканскага ўраду Джокякарта. Лётнішча Мачуво занялі галяндзкія парашутыстыя. У цэнтральнай Суматры галяндцы перайшлі дэмаркацыйную лінію, вызначаную ЗН. Злучэнньі галяндзкае флёты занялі ў Тубане нафтовыя тэрэны. Афіцыйна паведамляецца, што некаторыя члены дасюлешняга інданэзыйскага ўраду, якіх д-р Сукарно, прэм'эр Гатта, былы прем'эр Шарыр, міністар замежных спраў Салін і галоўнакамандуючы інданэзыйскай арміі разам з шэрагам інданэзыйскіх калітыкаў арыштаваныя. Перад заняцьцем Джокякарты галяндзкімі аддзеламі інданэзыйскае радыё паведаміла, што гэта зьяўляецца новай інвазыяй, нарушэньнем дагавору аб пераміры й пастановаў ЗН. Міжнародныя вайсковыя кругі ўважаюць, што галяндзкая акцыя добра падрыхтаваная, бо ў ёй прыймаюць удзел амаль 150 тысяч добра ўзброеных жаўнераў, тады як інданэзыйская рэспубліканская армія ня мае патрэбнай колькасьці аружжа й нявышкаленая. Паводля наглядальнікаў, гэтая акцыя можа закончыцца ўжо на працягу найбліжэйшых пару тыдняў. Аднак, з другога боку, Галяндыя мусіць лічыцца з магчымай пазьнейшай дзейнасьцю партызанаў.

Афіцыйнай прычынаў гэтае «паліцыйнае акцыі» галяндзкі ўрад лічыць тое, што «інданэзыйская рэспубліка, якая сабатавала ўсякую канструкцыйную палітыку, ня выканала сваіх забавязньняў, якія яна ўзяла на сябе ў дагаворы аб перамірры. Адначасна інданэзыйскія ўрадавыя кругі не далі адказу на ноту галяндзкага ўраду ў гэнай справе». Галяндзкі высокі камісар у Батавіі паведаміў, што камісія пасярэдніцтва ЗН была паведамленая аб галяндзкай акцыі.

Зараз жа пасьля пачатку акцыі ў галяндзкай сталі-цы паведамлена аб стварэньні часовага саюзнага ўраду для Інданэзіі. Гэты часовы ўрад будзе складацца з Саюзнай Рады, Саюзнага Парляманту й Рады Міністраў. У адозьве гаворыцца, што Інданэзія пад назовам «Злучаныя Штаты Інданэзіі» станецца незалежнай дзяржавай, зьвязанай з Галяндыяй дзяржаўнай вуніяй.

### БАЛЯНС ПАРЫСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

У сувязі з заканчэньнем Парыскай сэсіі ЗН, якая трывала амаль тры месяцы й дала ў выніку (паводля пратакольных абліченьняў) 10 мільёнаў словаў у прамовах, заявах і дыскусіях, швайцарская газэта «Ді Тат» зьмясьціла наступную заўвагу:

«Сэсія ЗН у Парыжы, якая цяпер якраз закончылася, ня была аднак такой безнадзейна нуднай, як гэта агульна думаюць. Прыкладам, вялікае зацікаўленьне выклікаў пажар у палацы ЗН. Гэта была, здаецца, адзіная сэнсацыя, якую перажыла гэтая сэсія падчас сваіх бесканечных дыскусіяў. А далей «сусьветны грамадзянін» Дэйвіс напасьледак пагадзіўся з прэзыдэнтам Івэтам. Раней яго былі выкінулі із залі за тое, што ён сказаў не прадугледжаную праграмаю прамову. Вось-жа выглядае, што ўсё-ж такі на гэтай сэсіі было штосьці й пазытыўнае. Потым яшчэ штрайкавала абслуга віндаў. Гэта прымусіла спадароў удзельнікаў сэсіі да вельмі здаровага фізычнага спорту — хадзіць пехатой па сходах. І гэта таксама было пазытыўным зьявішчам. Затое штрайк кельнэраў меў такі вынік, што іхныя нязручныя заступнікі часамі падавалі гасьцям дэсэрт раней чымсьці зупу. На жаль, гэта аднак не давяло да таго, каб у камісіях прыймаліся рэзалюцыі перад дыскусіямі над імі. І гэта было нэгатыўным».

### ВАЖНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ ЗЬЕЗД У ВАРШАВЕ.

Камуністычныя праваднікі з 22 краінаў, якія прыймалі ўдзел у Кангрэсе зьліцьця польскай камуністычнай партыі з сацыялістычнай партыяй, прабываюць цяпер у польскай сталіцы. Далей спадзяюцца яшчэ прыбыцьця іншых усходня-эўрапэйскіх дзяржаўных дзеячоў. Палітычныя кругі прадбачаюць у гэтым наступнае спатканьне камуністычных галавароў у Варшаве. Яны лічаць магчымым, што ўсходня-эўрапэйскія краіны будуць падрыхтоўваць у Варшаве кантракцыю супраць Атлянтычнага пакту заходніх дзяржаваў.

Польскі прэзыдэнт Баляслаў Бэрут 15 сьнежаня паведаміў праз радыё аб зьліцьці польскіх партыяў камуністых і сацыялістых.

### ЧЫСТКА Ў ЎСХОДНІМ БЛЁКУ

Паводля паведамленьня чэхаславацкай прэсавай службы ўрад Запатоцкага звольніў шмат высокіх дзяржаўных урадаўцаў з міністэрства замежных спраў. Гэты лёс спаткаў таксама былога пасла ў Белградзе і [illegible] у міністэрстве замежных спраў.

---

13 дэпутатаў партыі дробных уласьнікаў у Будапэшце зложылі свае мандаты, а 14 урадаўцаў партыйнай цэнтралі звольнена ў працэсе чысткі пасьля крызысу кабінэту ў мінулым тыдні.

---

### КАМУНІЗМ ТРАЦІЦЬ ГРУНТ ПАД НАГАМІ

Вярнуўшыся да США з аднамесячнага падарожжа па Эўропе амэрыканскі рэспубліканскі сэнатар Робэрт Тафт заявіў, што камунізм траціць у Эўропе грунт пад нагамі. Ён пазытыўна ацаніў спрыт генэрала Клея ў суадносінах да Саветаў і выявіў сваё перакананьне, што амэрыканскія войскі ні ў якім выпадку ня выйдуць з Бэрліна.

### Вялікапрастаровая Канцэпцыя

Сучасны цяжкі крызыс у міжнародным жыцьці катэгарычна змушае перадавых палітыкаў дэмакратычнага сьвету ратаваць ягонае існаваньне й культуру шляхам тварэньня рознага роду саюзаў, блёкаў ці вуніяў. Ужо існуе Заходня-Эўрапэйская вунія, якая мае быць пашырана Атлянтыцкім пактам, паўстаюць навет ужо зарысы агульна-эўрапэйскай вуніі.

Сярод паняволеных і загрожаных бальшавізмам народаў творацца таксама рознага роду канцэпцыі — Блёк народаў сярэдняй і ўсходняй Эўропы, канцэпцыя Інтэркантынэнту і г. д. У васнове усіх гэтых канцэпцыяў ляжыць адзін і той самы прынцып — саюз шматлікіх сувэрэнных народаў, засельваючых дадзеныя вялікія прасторы дзеля лепшага выкарыстаньня эканамічных рэсурсаў і дзеля пасьпяховай абароны супраць таго ці іншага імпэрыялізму. Новая агульная ідэя, як бачым, не ўзбуджае сумліву ў тым, што яна, пры добрай волі ўдзельнікаў блёку, саюзу ці вуніі, можа памагчы шматлікім народам з посьпехам зрабіць крок наперад па шляху прагрэсу й вызваленьня з-пад ярма тыраніі, гнёту й насільля.

Сярод гэных вялікапрастаровых канцэпцыяў нарадзілася, аднак, яе новая, нязвычайна своеасаблівая сястрыца. Зьявілася яна ў Лёндане. Перанесена ў Нямеччыну польскай газэтай «Лех». Маткай яе ёсьць польская эндэцыя, а айчымам пан Гэртых, бо запраўдным бацькам яе ёсьць в. п. Дмоўскі. Спачатку быў адкрыты артылерыйскі вагонь (шмат чаго на сьвеце родзіцца ў вагні) у нумары 67(88) ад 2 сьнежаня 1948 па здрайцах польскай «рацыі стану» з фэдэральных клюбаў «Міжморра». Гэтыя здрайцы, як быццам, за цану здабыцьця сымпатыяў беларусаў, украінцаў і летувісаў, гатовы замаўчаць ці адсунуць на «потым» пытаньне ўсходніх граніцаў Польшчы.

Пасьля такой «падрыхтоўкі», у наступным нумары «Леха» польскія эндэкі заяўляюць, што [illegible] нейкім там беларусам, украінцам ці летувісам, а трэба адкрыта й ясна заявіць, што польская рацыя стану вымагае найменей такой вось скромнай Польшчы: ад Балтыкі да Прута і ад Нісы да Дзьвіны. Польшча мусіць быць абсалютна незалежнай і сувэрэннай дзяржавай без ніякіх фліртаў з **нерасейскімі** (падкрэсьленьне рэд.) народамі.

Бязумоўна, дасканалая вялікапрасторовая канцэпцыя!! Мы добра разумеем польскіх абшарнікаў, якім сьняцца маёнткі на «Усходніх Крэсах»... Ім мы толькі скромна заўважым — панове, не забывайцеся, што часы Дон-Кіхотаў беспаваротна канулі ў вечнасьць...

Горшая ўжо рэч у тым, што вось зь імі поўнасьцю салідарызуецца ніхто іншы як... былы прэм'ер, старшыня Цэнтральнага Камітэту Польскае Партыі Сацыялістых пан Т. Арцішэўскі! (гл. «Кроніку» ад 19 сьнежаня 1948). Няўжо ён горшы сацыялісты чым чэскі генэрал Л. Прхала, які ўжо даўно прызнаў незалежнасьць славацкага нероду ў ягоных этнаграфічных межах? Няўжо ён ня бачыць, пражываючы ў Лёндане, што зрабіў ягоны сацыялістычны калега — міністар Бэвін з Індыяй, Цэйлонам, Бірмай? Пан Т. Арцішэўскі, як павадыр польскіх сацыялістых, меў бы быць прынамсі дэмакратам, няхай сабе шавіністым, але ўжо ў ніякім выпадку — імпэрыялістым!

У сваім інтэрвью для польскай газэты «Дзеньнік Польскі» ад 10 сьнежаня 1948 ён, між іншым, кажа: «ППС стаіць на грунце непадзельнасьці Польскае дзяржавы. Актаў у Тэгеране й Ялце, на падставе якіх ад Польшчы былі адабраныя **польскія** (падкрэсьленьне рэд.) землі ўсходнія, мы не прызналі й ніколі не прызнаем». Павадыр польскіх сацыялістых навет не гаворыць аб тым, што ад Польшчы былі адабраныя ўсходнія землі, не, проста — польскія! Ці забыўся польскі сацыялісты прыгэтым аб тым, што на гэтых «польскіх» землях у свой час крыві калега Голубка замест прызнаць мясцовага насельніцтва знайшоў сабе магілу? А ці даўно фюрэр аднаго вялікага народу ў Эўропе называў і польскія і беларускія і украінскія і летувіскія і інш. землі нямецкай уласнасьцю?

Якімі-ж катэгорыямі думае польскі сацыялісты? Ці дзіўна пасьля гэтага, што ў Эўропе шмат перадавых людзей зь недаверам адносіцца да польскага сацыялізму й польскае дэмакратыі? Ці польскі сацыялісты думае, што Атлянтычная Хартыя напісана толькі для Польшчы?

Мы зусім не зьбіраемся вучыць пана Арцішэўскага, што ён, як сацыялісты, меў бы гаварыць сяньня адносна супольнага фронту паняволеных народаў, адносна самавызначэньня народаў і іх свабоды. Мы толькі хацелі-б сказаць яму: тысячы нашых партызанаў, якія аддаюць сваё жыцьцё ў сяньняшнім змаганьні з бальшавізмам, думаюць таксама аб тым, каб як найхутчэй разарваць на кускі дагавор у Тэгеране й Ялце з аднэй маленькай розьніцай у параўнаньні з панам Арцішэўскім, а менавіта: І. Сяньняшняя лінія Кэрзона зьяўляецца вялікай крыўдай для Беларускага народу, што яна павінна быць перасунута крыху на захад, 2. прагнаць з свае зямелькі на заўсёды апошняга тырана й ката Беларускага народу — бальшавікоў і 3. аднавіць на сваіх этнаграфічных землях вызваленае свабоднае волі Беларускага народу яшчэ з 1917 г. — Беларускую Народную Рэспубліку, што зрэштай таксама адпавядае прынцыпам Атлянтычнай Хартыі.

## Горш за атамную бомбу

### ЖАХІ БУДУЧАЙ БАКТЭРЫЯЛЯГІЧНАЙ ВАЙНЫ

«Прыгатаўляецца бактэрыялягічнае й хімічнае аружжа, якое настолькі ёсьць магутнай зброяй, як і атамная бомба. Дзяржавы-сябры Задзіночаных Нацыяў падчас апошняй сэсіі ў Парыжы прызываюцца выкарыстаць усе магчымасьці, якія зьяўляюцца ў распараджэньні ЗН, каб разьвязаць праблему кантролі гэтага роду аружжа». Гэтыя два сказы, узятыя з гадавой справаздачы генэральнага сакратара ЗН, зьўляюцца першай афіцыйнай перасьцярогай.

Хаця досьледы з прычынаў бясьпечнасьці трымаюцца ў тайніцы, аднак навуковыя публікацыі ў Амэрыцы здраджаюць характар і сілу дзеяньня новага аружжа. Бактэрыялягічная вайна або «распаўсюджваньне эпідэмічных хваробаў у вялізарных разьмерах» ужо ад нескалькіх год прыгатаўляецца ў Задзіночаных Штатах. У 1942 г. зарганізавала мяшаная амэрыканска-канадыйская камісія тайную лябараторыю на абтоку Сэн-Ляўрэнт. Пачынаючы ад 1942 да 1946 г. студыявалі ЗША, Канада й Вялікабрытанія 13 хваробаў людзей, зьвярат і расьлінаў. Праца, распачатая падчас гэтых студыяў, праводзіцца сяньня далей у лягеры Дэтрік штату Мэрыленд, дзе арміяй была зарганізаваная спэцыяльная лябараторыя. Тут у васноўным дасьледаваюцца магчымасьці пашырэньня за пасярэдніцтвам паветра хваробаў і затруцьця. Хваробы, пашыраныя за пасярэдніцтвам вады й прадуктаў, зьўляюцца мала эфэктоўнымі й прыдаюцца перадусім для актаў сабатажу. Дзеля гэтага адпаведныя дзейнікі прыступілі да гадаваньня бацылаў, якіх можна штучна рассыпаць з паветра на цэлыя аколіцы ў форме вялікіх хмараў пылу. У гэткім випадку эпідэмія вялізарных разьмераў зьяўляецца пэўнай.

Бактэрыі гэтых хваробаў зьўляюцца жывымі. Апрача гэтага ўжываецца Ботулін, які зьўляецца хімічнай субстанцыяй і прадстаўляе сабою нязвычайна сільную атруту: Ён у форме дробных частак пылу можа цэлымі месяцамі знаходзіцца ў паветры й лёгка затруваць прадукты выжыўленьня цэлых гарадоў. Для зьнішчэньня ўраджаю служыць спэцыяльная кіслата, якая зьяўляецца ведамай пад назовам «2,4 Д». Ужо ўдалося выгадаваць заразкі эпідэмічных хваробаў у такой згушчанай форме, што тэарэтычна хопіць аднаго грама, каб заразіць насельніцтва ўсяго сьвету. Кажная выпрадукоўваная ў лягеры Дэтрык унцыя зьмяшчае ў сабе астранамічную лічбу заразкаў. М. Фэйнэр піша у «Гарпэс Магазын»: «Калі-б падчас апошняй вайны адзін адзіны раз было примененае біялягічнае аружжа, то атамная бомба аказалася-б амаль зусім нявінным сродкам». Падчас таго, калі забясьпечаньне перад заражэньнем зьяўляецца вельмі цяжкім, няпэўным і праблематычным, то прадукцыя бацылаў — у праціележнасьць да атамнай бомбы — зьяўляецца нязвычайна простай. Натолькі простай, што якая-колечы кантроля наагул зьяўляецца немагчымай. Адзін адзіны сабатажнік мог-бы ў ваднэй маленькай лябараторыі выпрадукаваць дастаткова атруты, каб спрычыніць сьмерць усяму чалавецтву. Сумленьне цывілізаванага сьвету, а перадусім сумленьне навуковых дасьледавальнікаў зьяўляюцца адзінай магчымай кантроляй гэтага страшнага аружжа.

(«Ім Аўсляндэ»).

### ПЕРАСЬЦЯРОГА

Беларускі Камітэт у лягеры Мэнхэгоф каля Касэлю лічыць сваім абавязкам перасьцерагчы беларускае грамадзтва перад наступнымі асобамі, якія, належачы да мясцовага «Комитета Росийской Эмиграции в Каселе и Менхегофе» і бяручы ў ім актыўны ўдзел, адначасна падшываюцца пад беларускія арганізацыі, выдаюць пры помачы расейскіх салідарыстых лістоўку п. н. «Голас Беларуса» і ўсякімі спосабамі стараюцца шкодзіць беларускай нацыянальнай справе: 1) Ільля Калько, 2) Язэп Гаваркоўскі, 3) Андрэй Канавальчук і 4) Анатоль Ушал.

Вышэй пералічаныя асобы належылі ў свой час да Беларускага Камітэту, але былі стуль выкінуты за шкодную дзейнасьць і за супрацоўніцтва з расейскімі імпэрыялістымі ўсіх масьцяў. Асобы гэтыя будуць пацягнены да судовай адказнасьці за выступленьні ад імя 5 Сьцягу Беларускіх Скаўтаў у Мэнхэгофе і ад імя Беларускага Камітэту ў Мэнхэгофе.

Мэнхэгоф, 8.12.48.

**Беларускі Камітэт лягеру Мэнхэгоф.**

# ВІТУШКА АПРАЎДАЎ ДАВЕР

## 45.000 ПАРТЫЗАНАЎ ЗМАГАЕЦЦА ЗА НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

Як многім ведама, зімою 1944 г. беларускі маёр Міхал Вітушка разам з групаю іншых беларускіх патрыётаў перакінуўся зь Нямеччыны цераз нямецка-бальшавіцкі фронт на Беларусь, каб там арганізаваць партызанскае змаганьне беларускага народу супраць бальшавіцкага акупанта. Хутка пасьля гэтага пачалі пранікаць у Нямеччыну весткі аб ягонай там ажыцьцяўленай дзейнасьці. Весткі гэтыя йшлі да нас рознымі дарогамі аж да апошняга часу. Зь іх вынікала, што маёр Вітушка разьвіў там шырокую партызанскую дзэйнасьць, стаўся пострахам для бальшавіцкіх акупантаў, а сярод народу імя ягонае вырасла да легендарных разьмераў. Цэнным і сьвежым пацьверджаньнем праўдзівасьці гэтых вестак ёсьць справаздача перабегшага нядаўна на гэты бок аднаго нямецкага ваенна-палоннага, удзельніка партызанскай вайны ў аддзеле Вітушкі, якую надрукавала нямецкая газэта «Абэндпост» (з 11 сьнежаня 1948 г.), што выходзіць у ангельскай зоне. Так як гэтая справаздача паходзіць ад нямецкага жаўнера й зьмяшчае рад добра нам ведамых фактаў, успаміне пра ведамых нам мясцовасьці, у праўдзівасьці яе нельга сумлявацца. А дзеля таго, што прыносіць яна многа цэнных дадзеных аб змаганьні беларускага народу супраць бальшавізму, перадрукоўваем яе ў цэласьці:

«Тое, што я расказваю, мне прыйшлося самому перажываць. Я належыў да ліку 275.000 партызанаў, якія на тым баку «зялезнай заслоны» прыймаюць удзел у «гарачай вайне». Я стаяў перад ваенным судом і знаю асабіста Вітушку й Зэнона й тое, што яны не зьяўляюцца толькі легендарнымі героямі, але ёсьць і сапраўднымі жывымі людзьмі.

Мая гісторыя ў месяцы ліпені 1947 г., калі я разам зь яшчэ адным нямецкім лётнікам, ня пытаючыся расейцаў, сеў у савецкі самалёт «П 2» і разьвітаўся з палонам. У Усходняй Прусіі ў мясцовасьці Грынліндэ каля Вэляў мы былі змушаныя прызямліцца. Мы апрануліся ў жаночую вопратку й хацелі прабірацца далей пехатой. Не прайшло многа часу, калі нас абкружылі ўзброеныя, адзетыя па цывільнаму, людзі, якія пачалі гутарыць з намі на расейскай мове. Тут я хачу зазначыць, што я вельмі добра ўладаю польскай мовай і што, будучы ў палоне, навучыўся й расейскае. Мы ўважалі, што будзе лепей, калі мы скажам, што ўцяклі з савецкага палону. Але гэтыя людзі нам ня верылі. Мы завялі іх тады да нашага самалёту й мусілі даказваць, што мы зьяўляемся немцамі, пасьля чаго яны заявілі, што зьяўляюцца партызанамі. Таму, што яны ў Усходняй Прусіі ня мелі ніякіх магчымасьцяў, каб нам памагчы перапрaвіцца ў Нямеччыну, дык запрапанавалі нам, каб мы далучыліся да іх. Дзеля таго, што нам не аставалася нічога іншага рабіць, мы згадзіліся астацца. Нас перадавалі з аднае вёскі ў другую й такім спосабам мы апынуліся ў ваколіцак Коўна. Тут упяршыню спаткаўся я зь Вітушкам — камандзірам партызанаў, перад якім усе маюць страх і які мяне дапытваў. [illegible] пагляд. Калі я яму сказаў, што, будучы [illegible] лётнікам нямецкіх лётніцкіх сілаў вазіў самалетам людзей і аружжа для беларускага руху супраціву, вылічаючы мясцовасьці й даты гэтае акцыі, давер быў здабыты.

Вітушка зьяўляецца фанатычным праціўнікам бальшавізму. Ён хоча змагацца ўсімі сродкамі за незалежнасьць свае беларускае бацькаўшчыны. Сваю арганізацыю пачаў ён будаваць ужо ў 1944 г. пры дапамозе вышэйшых нямецкіх афіцэраў з адрэзку фронту «Паўночны-Ўсход». Сяньня «Чорны Кот» (так называецца аддзел Вітушкі — Рэд.) ахоплівае 45.000 беларускіх, летувіскіх і латыскіх партызанаў, якіх сувязі сягаюць аж да Эстоніі. Яны поўнасьцю гаспадараць лясамі ў ваколіцах Коўна, Маладэчна, Ліды й Баранавічаў. Сотні немцаў, якія згубілі сем'і й бацькаўшчыну й якія з палітычных прычынаў ня хочуць вяртацца дамоў або ня могуць вызваліцца з палону, далучаюцца да «Чорнага Ката». Навет ёсьць чыста нямецкія адзінкі, да якіх аднак прыдзеленыя мясцовыя праваднікі. У сьпісах Вітушкі фігуруюць яны, як батальёны «Эдэльвайс», «Цэпэлін» і «Вэрвольф».

З Коўна я быў адкамандзіраваны для выкананьня майго першага заданьня. Я прыбыў у Вільню й вельмі зьдзівіўся, што гэты так вялікі горад выглядаў, як-бы быў партызанскім гняздом. Мы маглі тут даволі свабодна рухацца. Жандармэрыя й паліцыя ня маюць адвагі пачынаць што-небудзь супраць людзей Вітушкі, бо баяцца яго помсты, аб чым ужо маюць яны добрае дасьветчаньне. На буфэрах таварнага цягніка мы выехалі зь Вільні ў Ліду. Цэлы гэты адрэзак ахраняецца паліцыяй і войскам. Нам не рабілі нічога, бо мы мелі адпаведныя паперы (зразумела, сфальшаваныя), а да гэтага такі спосаб падарожжа там зусім звычайны.

Некалькі дзён назад агенты «Чорнага Ката», якія служылі ў чыгуначнай паліцыі, перадалі цераз радыё, што а такой і такой гадзіне цераз Маладэчна мае праходзіць транспарт з 36 штукамі нямецкага распладаванага былда. Гэты цягнік мы ўзарвалі. У свой час былі падрыхтаваныя фурманкі й грузавыя аўтамашыны зь пераадзетымі за савецкіх жаўнераў шоферамі, якія ўсю здабычу даставілі да адпаведных партызанскіх адзінак.

Ня ўсе партызаны пражываюць у лесе. Там жывуць толькі маладыя, бояздольныя мужчыны й жанчыны або тыя, што ня ведаюць мясцовай мовы. Старэйшыя й жанчыны — гэтыя таксама памагаюць часта ў сельсаветах ці паліцыйных установах, а паяўляюцца толькі тады, калі іх паклічаць дзеля выкананьня тае ці іншае акцыі. Супрацьдзеяньні расейцаў і мясцовых камуністых ня маюць большага посьпеху ад нямецкіх дзеяньняў супраць чырвоных партызанаў у часе апошняе вайны. Апошнім часам прабуюць расейцы змагацца з партызанамі пры дапамозе правакатараў, якія паяўляюцца паадзіночна або навет і ў форме цэлых бандаў.

Калі я заявіў, што хацеў-бы вярнуцца дамоў, дык [illegible] арганізацыі: «Чорны Кот», польская НСЗ і украінская УПА із сваімі 145.000 людзьмі пераважна мала між сабою супрацоўнічаюць таму, што кажная зь іх на сваіх сьцягох мае выпісане як мэту — змаганьне за свае незалежныя нацыянальныя дзяржавы. Аднак пэўнае супрацоўніцтва існуе, калі йдзе аб абмен весткамі, памозе немцам, каб дастацца ў сваю бацькаўшчыну, або такім уцекачом, якім грунт гарыць пад нагамі. І так я дастаўся да НСЗ, кіраўніком якой зьяўляецца Зэнон, якому падпарадкоўваюцца 85.000 польскіх партызанаў. Ён яшчэ й сяньня сьвдзіць у якасьці афіцэра ў польскім ген. штабе і напэўна ўжо няраз прыходзіцца яму самому перадаваць далей загад аб тым, што таго, хто яго затрымае, чакае вялікая ўзнагарода. Я зь ім пазнаёміўся 8 лютага 1948 г. ў лесе на захад ад Берасьця, калі ён вэрбаваў 150 новых сяброў, якія тады складалі прысягу на польскі сьцяг і пісталет. Якраз у гэтым часе меў па радыё прамову тагачасны міністар нутраных справаў Гамулка, якую мы таксама слухалі й у якой Гамулка заявіў, што паліцыя ў змаганьні з партызанамі не павінна больш браць палонных. Твар Зэнона пацямнеў. Ён падаў тады да ведама новую форму прысягі: вока за вока..., якая зараз-жа была перададзена ўсім адзінкам НСЗ цераз кароткахвалёвую радыёперадачу.

НСЗ, падобна дзьвюм успомненым баёвым арганізацыям, тарнуюць тэрор. Старшыні воласьцяў, паліцыйныя ўрадаўцы, а таксама й расейскія каменданты, якія допускаюцца насільля над цывільным насельніцтвам, атрымоўваюць ад Зэнона прысуд сьмерці, які пасьля гэтага хутка й выконваецца.

Ці насельніцтва, пасьля доўгіх гадоў вайны й акупацыі, ня хоча мець супакою й ці не ненавідзіць партызанаў? Гэта справа не такая простая. Па першае, у тых ваколіцах «шляхотных разбойнік» ужо заўсёды ўважаецца за народнага героя, апрача гэтага некаторым перасьледаваным сялянам больш падабаецца, калі ягоны двор пойдзе з дымам, чымсьці будзе адабраны й зданы ў калгас. Зразумела, ведаюць добра й партызаны й сяляне, што так вечна трываць ня можа. Зэнон сказаў мне й гэта агульна ёсьць пануючай думкай: «Не пазьней, як у 1949 годзе мы злучымся зь дзьвюма іншымі арганізацыямі ў вадну вызвольную армію. І не пазьней, як у 1949 годзе, успыхне сусьветная вайна. Тады мы станемся вольнымі, і савецкая армія перакавнаецца, што гэта значыць, калі ўсе народы паўстануць супраць яе.

Адкуль бяруць партызаны аружжа й іншае забясьпечаньне? Многае дастаецца ад ворага. Але гэта ня ўсё. Нажаль, я не магу Вам дакладна аб гэтым сказаць, але гляньце на мой сьвэтар: Вы ўбачыце многа гэткага сорту ў Нямеччыне, але яны ня ёсьць робленыя ў Нямеччыне.

Напасьледак НСЗ паслала мяне ў вадзін із штабаў польскае арміі, якая мела за заданьне засяленьне г. зв. польскае заходняе тэрыторыі, што ляжыць на ўсход ад Одры й Ніссы. Калі мы йзноў спаткаемся, дык я Вам раскажу, як гэтая справа засяленьня праводзіцца».

## АЎГЕН ФОН ЭНГЭЛЬГАРДТ

7 лістапада ў санаторыі Сімбах у Баварыі, пасьля доўгалетняй цяжкай хваробы, закончыў сваё працавітае жыцьцё выдатны вучоны, здольны літарат і вялікі прыяцель беларускага народу — Аўген фон Энгэльгардт.

Паходзіў Энгэльгардт з старога нямецкага роду, што ўжо ад 300 гадоў жыў у беларускай Дзьвіншчыне. Там яшчэ ў хлапецкія гады таварышамі ягоных гуляньняў былі дзеці акалічных беларускіх сялян. Пазьней, як заядлы паляўнік, ён брадзіў разам зь беларускімі лясьнікамі па наваколькіх лясох і пушчах Дзьвіншчыны. Стуль ад самога маленства Энгэльгардт добра пазнаў і палюбіў беларускую мову, звычаі й беларускі народ.

Вось тая пачуцьцёвая сувязь, якая завязалася ў Энгэльгардта зь беларускаю зямлёю яшчэ ад юнацкіх гадоў, і была тым галоўным дзейнікам, які піхнуў пазьней Энгэльгардта да цярплівай і вытрывалай працы над навуковым вывучэньнем Беларусі і над перакладамі беларускіх твораў на нямецкую мову.

Хаця з пытаньнямі беларускага палітычнага адраджэньня Энгэльгардт стыкнуўся яшчэ ў пару першай сусьветнай вайны ды свае сыстэматычныя студыі над беларускай гісторыяй, геаграфіяй, эканомікай і літаратурай распачаў ён фактычна толькі ў трыццатых гадох, пасьля свайго павароту з Аўстраліі.

Паволі, з награмаджэньнем матарыялаў, выпісак і зацемак, паўстае ў Энгэльгардта думка і амбіцыя ўлажэньня грунтоўнай, і тымчасам у нямецкай навукавай літаратуры адзінай некалькітомнай працы — манаграфіі аб Беларусі й беларускім народзе, працы, якая была-б падручнаю інфармацыйнаю кнігаю для кажнага, хто хацеў-бы бліжэй пазнацца з пытаньнямі беларускімі.

Ён пісаў аб тым, — гэта вельмі характэрнае і тыпова нямецкае зьявішча, — што нямецкая навука й літаратура мае вялікія працы аб нейкіх канібальскіх плямёнах на далёкіх морах, або ад тысячаў ужо гадоў вымерлых народах, але амаль што нічога аб ад гістарычных часоў блізка, пасуседзку жывучым шматмільённым народзе беларускім.

Вось гэтую хібу нямецкай навукі Энгэльгардт намагаўся направіць і з усёй свомай сабе нямецкай акуратнасьцяй і цярплівасьцяй узяўся за зьбіраньне навуковага матарыялу.

Ужо ў 1940 годзе паяўляецца ягоная першая большая зацемка аб Беларусі ў кніжцы «Дэр нагэ Остэн». У працы гэтай Энгэльгардт праявіў ужо ўсю тую шырыню і грунтоўнасьць, зь якою ўмеў ён падыйсьці да пастаўленага сабе навуковага заданьня.

Ды вайна была ўжо ў поўным разгары. На спакойныя сыстэматычныя студыі ня было адпаведных умоваў. Энгэльгардта мабілізуюць у армію. Распачатую працу прыходзіцца адлажыць на пазьней, хаця матарыялаў было ўжо сабрана на некалькі тамоў друку.

Тымчасам разьвіцьцё палітычных падзеяў моцна актуалізуе беларускае пытаньне і Энгэльгардт атрымлівае прапазыцыю надрукаваць сваю працу ў існуючым «сырым» стане, не чакаючы на дакладную пераапрацоўку і выканчэньне. Так паўстае ягоная кніга «Вайсрутэньен» (Эўгэн Фрайгэр фон Энгэльгардт: «Вайсрутэньен, Фольк унд Лянд, Бэрлін 1943, бал. 358).

У кнізе гэтай зьмешчаная частка сабранага Энгэльгардтам матарыялу ў кампілятыўнай форме, без дакладнай пераапрацоўкі паасобных аддзелаў. Пасьля вайны аўтар зьбіраўся выдаць задуманую працу другім поўным, некалькітомным выданьнем. Як другая частка працы яшчэ ў вайну мела паявіцца кніга ілюстрацыяў. І гэты том быў здадзены ўжо ў друк, ды, на няшчасьце, быў зьнішчаны падчас вайны разам з разьбітаю друкарняй. «Вайсрутэньем» Энгэльгардта зьмяшчае ў сабе аграмадную колькасьць ведамасьцяў зь гісторыі, геаграфіі, эканомікі й культуры Беларусі. Асабліва цэннае ў ёй — гэта сотні зацытаваных дакладна жаролаў, што моцна аблягчае кажнаму эвэнтуальна паглыбіць свае ведамасьці ў кажнай жаданай галіне. З асаблівым захапленьнем пісаны разьдзел аб звычаях і абрадах на Беларусі, відаць з асабістых перажываньняў і ўспамінаў.

Праца гэтая, як друкаваная на сьпех, не пазбаўленая і некаторых недакладнасьцяў ды памылак, асабліва калі ходзіць аб апісаньне нашай паўдзённа-заходняй мяжы (Палесьсе). Памылак гэтых Энгэльгардт вельмі шкадаваў і зьбіраўся іх выправіць у другім выданьні сваёй працы. Ды на гэта, нажаль, не пакінула яму ўжо часу ані сілаў цяжкая хвароба грудзей.

З заканчэньнем вайны Энгэльгардт знайшоўся ў санаторыі. Безаглядная хвероба паволі, але кансэквэнтна нішчыць сілы. Усё лячэньне аказваецца безрэзультатным. У такіх умовах працаваць над выканчэньнем сваей манаграфіі аб Беларусі няма ніякіх магчымасьцяў, тымболей, што ўсе сабраныя матарыялы і зацемкі ў часе вайны пагінулі.

Ды і на санатарыйным ложку Энгэльгардт намагаецца яшчэ аддаць сваю апошнюю дань краіне свайго дзяцінства. Маючы побач выдатных навуковых здольнасьцяў і не малы літаратурны талент, ён цяпер бярэцца за пераклад на нямецкую мову лепшых твораў беларускай літаратуры ў прозе й вершы.

Нічога дзіўнага, што з паэзіі найбольш яму блізкім аказаўся Максім Багдановіч — той-жа трагічны лёс і сьмерць аднаго й другога, тыя самыя перажываньні й пачуцьці ў ваблічы ніяўхільнага, блізкага канца далёка ад дарагой роднай зямлі. Так паўстае зборнічак перакладаў «Вайсрутэнішэ Гаймат — Лірык фон Максім Багдановіч» (у друку). Пераклаў таксама Энгэльгардт Багдановічаў «Апокрыф», глыбокі філёзофічны зьмест якога уняты ў мастацка беззаганную форму, падбіў ягонае сэрца.

Прыгатаваў ён таксама да друку зборнік беларускіх апавяданьняў панямецку. Нелітасьцівая і перадчасная сьмерць засьпела яго пры працы над перакладам найлепшых твораў нашага пясьняра — прарока Купалы.

Разам з Энгэльгардтам адыйшоў у вечнасьць выдатны вучоны, паэта і вялікі прыяцель беларускай справы. Ягоная кніга «Вайструтэньен» яшчэ на доўгія гады астанецца незаменным падручным жаралом, дзеля нямецкай мовы даступным для кажнага палітыка і навукоўца сьвету. Разам зь ягоным адыходам паменшалі і так нешматлікія рады знаўцаў беларускай справы ў заходняй Эўропе.

Дзеля гэтага вось страта гэтая асабліва нам балючая і таму над сьвежаю магілай хіліць сяньня сваю галаву з пашанаю і вялікім жалем кажны беларус.

**В. Максімовіч.**

---

**Maksim Bahdanovic**

**MEIN LETZTER WUNSCH**

**Übertragung aus dem Weißruthenischen**
**von Eugen Freiherr von Engelhardt**

**Ich lieg' todkrank an Körper und an Seele,**
**Fern, wie verbannt**
**Von dir, dem Letzten, auf das ich noch zähle:**
**Mein Heimatland!**
**In deinen Wäldern weiß ich eine Quelle**
**So klar und rein:**
**Des Lebens Wasser quillt an dieser Stelle**
**Aus Sand und Stein.**
**Dort könnt' ich meinem Leid Vergessen trinken**
**Nach Herzenslust**
**Und, müßt' ich sterben, würd' ich sterbend sinken**
**An deine Brust.**
**Die Erde wird nicht schwer dem treuen Sohne**
**Im Heimatland,**
**Und ew'gen Frieden nehm' ich dann zum Lohne**
**Aus deiner Hand.**

---

## АД УПРАВЫ СТУДЭНЦКАГА СТЫПЭНДЫЯЛЬНАГА ФОНДУ

Гэтаю дарогаю Управа ССФ складае ад імя беларускага студэнцтва ў Нямеччыне шчырую падзяку слаўнай «Дванаццатцы» ў Ангельшчыне за прысланую ёю ахвяру на карысьць ССФ вартасьцю 400 нямецкіх марак. Управа ССФ перасылае таксама сардэчнае дзякуй Беларусам у Канадзе за сабраную й пераcланую ССФ ахвяру вартасьці 100 нямецкіх марак.

Дзякуючы гэтым ахвярам і старым запасам, Управа ССФ змагла ў бягучым 48 — 49 сэмэстры выдаць для 12 найбольш патрабуючых студэнтаў стыпэндыі ў суме 1550 н. м. і, як аплату за дзяржаўныя экзамены аднае абсальвэнткі мэдыцыны-дэнтыстыкі, 225 н. м. Хоць гэтых стыпэндыяў ня хопіць на аплату навет унівэрсытэцкай таксы, аднак яны зьяўляюцца вялікай дапамогай, у многіх выпадках адзіна ратуючай бязвыхадные палажэньне нашых студэнтаў.

Ангельская «Дванаццатка» й Беларусы з Канады хай будуць прыкладам ахвярнасьці для беларускае эміграцыі ў другіх краінах і кантынэнтах сьвету!

**Управа ССФ пры ЦБСАЧ.**

# СПРАВЫ ДП

## 2.000 ДП У ТЫДЗЕНЬ У ЗША МОЖА АДПРАЎЛЯЦЬ ІРО

Эміграцыйны пэрсанал ІРО мае магчымасьць аформіць і прыгатаваць дакумэнты для 2.000 ДП у тыдзень для адпраўленьня іх у ЗША згодна новага эміграцыйнага закону з 1948 г. Ці аднак столькі асоб можа быць у тыдзень перавезена, гэта залежыць ад многіх тых установаў, якія ўпаўнамочаны для правядзеньня ў жыцьцё эміграцыйнага закону, а імeнна ад: 1. Амэрыканскай Камісіі ДП, якая мае прадставіць гарантыі памешканьня й працы й сьцьвердзіць згодна з гэтым законам эміграцыйныя здольнасьці кандыдата, 2. СІС, якое правярае палітычную надзейнасьць кандыдатаў, 3. Амэрыканскай Публічнай Службы Здароўя, якая правярае дакумэнты аб стане здароўя, 4. Віцэ-консуля, які павінен сьцьвердзіць права на эміграцыю згодна ўспомненага закону й выставіць візу й 5. Эміграцыйна-натуралізацыйнага ўраду, які праводзіць апошнюю праверку пры ад'езьдзе.

Генэральны Дырэктар ІРО на амэрыканскую зону сп. Рысн заявіў: «Мы можам так доўга прыгатаўляць для выэміграваньня 2.000 ДП у тыдзень, пакуль Амэрыканская ДП Камісія будзе ад нас гэтага вымагаць. Мы маем кандыдатаў, мы можам усе патрэбныя фармальнасьці выканаць і маем таксама ў сваім распараджэньні патрэбныя караблі. Што тычыцца ІРО, тое ўсё можа быць своечасова выканана».

Генэральны Дырэктар апрача гэтага падаў да ведама, што спаміж устаноўленага для эміграцыі ў ЗША кантынгэнту ў вышыні 205.000 чалавек, 144.000 прадугледжана для амэрыканскай зоны Нямеччыны, 30.000 для Аўстрыі і 31.000 для брытанскай зоны Нямеччыны й Італіі. Каб на працягу 18 месяцаў перавесьці ўвесь прадугледжаны кантынгэнт, павінна — на думку ІРО — выяжджаць месячна каля 8.000 асобаў.

Уключна з выехаўшымі апошнімі днямі ДП выехала дагэтуль ад пачатку эміграцыйнай акцыі (21 кастрычніка) 2.464 асобы ў ЗША. ІРО спадзяецца, што ў студзені зможа выехаць каля 3.400 асобаў. Прадугледжаная колькасьць 2.000 ДП у тыдзень зможа быць рэалізаванай толькі з палавіны лютага наступнага году.

**(«Інфармацыя ІРО» № 59).**

## СКОЛЬКІ ВЫЕХАЛА Ў МІНУЛЫМ ТЫДНІ?

У мінулым тыдні выехала ДП звыш 4.900 чалавек у наступныя краі асяленьня: 1.475 у Канаду, 1.200 у Аўстралію, 825 у ЗША, 422 у Вэнэцуэлю, 150 у Турцыю й 102 у Мароко.

**(«Інфармацыя ІРО» № 59).**

# КАЛЯДЫ

На ўспамін аб іх так соладка робіцца на сэрцы, але адначасна й сумна... Душа ўцякае туды, далёка на Бацькаўшчыну, дзе родныя: тата, мама, браты, сёстры, сваякі засядалі прастарым абычаем у сьвяты вечар куцьцю спажываць, Нараджэньне Хрыста спатыкаць... Ці ды дзе засядуць яны цяпер? Калі й засядуць, то безь мяне. Я тут, на чужыне, дзе іншыя абычаі, лучуся душою з сваімі, дзялюся ў духу зь імі аплаткам, куцьцёю, сардэчнымі думкамі... Тужна... Сьлёзна тужна...

Чар зімы, нашай беларускай сьнежна-брыльлянціста-марознай зімы... Перадсьвяточныя турботы: шыцьцё, мыцьцё, ладжаньне, ухарашваньне, чаканьне...

Урэшце — сьвятая ўрачыстая Куцьця. Снапок на покуці. Сена пад настольнікам. У сэрцы стала беласнежная каляда, куцьця. Пажаданьні, гаданьні. Піяньне. Мілыя каханыя госьці. Нейкая таёмная багавейная, салодкая, расшыраючая сэрца, атмасфэра дабраты, прабачаньня, каханьня. Хмель гумару ды патрыятычнага рамантызму...

А калядкі, зьвязда, каза, шчадроўнікі... Да таго ўсяго — наша каханая пышнастройная, прамянеючая ад сьвечак, цацак ды панадных дарункаў, высокадастойная князёўна Ёлка-Ялінка — той прыгожы сымбаль нованароджанага, ласкамі-дарамі шчодрага, Хрыста Збавіцеля. А над гэным усім — нашы мілыя-наймілейшыя, багатыя духам ды чароўна расхарошаныя парываючыя ў неба песьнямі й сьвяточнымі цэрэмоніямі, сьвятыні хрысьціянскія, дзе мы расьцём, магутнеем духам, шчасьлівеем...

Бачыце, што значаць Каляды. Што знача сьвята. Якжа нялюдзка, шэра, убога, нудна ды безнадзейна выглядала-б жыцьцё нашае бязь іх. Дык нічога дзіўнага, што народ наш, асабліва моладзь, іх так цэніць, любіць ды бароніць ад грубага бязбожжа.

Каляды. Так называлася калісь у нашых прашчураў вялікае Сьвята Зімы. Прадзеды бо тады яшчэ абагаўлялі прыроду і ў чэсьць яе, асабліва з нагоды важнейшых зьмен і праяваў ейных сіл, мелі звычай рабіць абрадавыя абходы ў прызначаныя на гэта дні. Бяз рэлігіі, бач, нельга было жыць. Калі разам з культурным поступам прышло к нам Хрысьціянства, яно, не адкідаючы з старасьвеччыны таго, што было разумнае, прыгожае й здаровае, увяло свае абычаі, сьвяты, абходы й цэрэмоніі, маючы на ўвеце, па-за натуральнымі фізычнымі (адпачынак), і духовыя патрэбы чалавека. Асталося, напрыклад, многа старых назоваў, між іншымі й Каляды. Хрысьціянства ў гэтае сьвята ўставіла новы свой зьмест: Хрыстовага Нараджэньня, Уцелаўленьня Сына-Бога, прыняўшага праз цудоўныя нарадзіны людзкую натуру, каб падняць чалавека, каб збратацца з намі, стацца даступнейшым ды памагчы ў жыцьці-збаўленьні. Сталася гэта неабходным пасьля таго, як людзі ўжо так сябе скалечылі грэхам, так вывіхнулі права й натуру, што не маглі самі наставіцца на добрую дарогу маральнага поступу, вядучую да шчасьця. Хто з добрым паглядам чытаў гісторыю, той ведае, як дахрысьціянскі сьвет быў зьбянтэжаны маральна й духова. Таму-ж, паміма багацьця культуры й тэхнікі матарыяльнай, паміма мілітарнай сілы, усьцяж гнілі сацыяльна й маральна ды распадаліся дзяржавы: Егіпет, Асырыя, Бабілёнія, Пэрсыя, Грэцыя. Рым...

Новая адраджэнская эра прыйшла на сьвет разам з Хрыстом. Цікавыя абставіны Хрыстовых нарадзінаў падаюць нам гістарычныя дакумэнты, у першую чаргу Эвангэліі.

У маленькай Палестынскай мясьціне, Бэтлеі, у трыццатым годзе панаваньня рымскага цэзара Аўгуста, падчас вялікага перапісу жыхарства, у надта ўбогай прыгорнай пячоры-стайні (дзеля недахопу прытулішча ў мястэчку), ціха, скромна, убога прышоў на сьвет Хрыстос. Праўда, прышоў Ён разам з цэлым Небам, нескончаной сваёй дастойнасьцяй, як і прыстоіла вечнаму Валадару сусьвету, але таёмная прамудрасьць Ягоная скрыла перад вачыма людзкімі тую сьветазарную веліч, адхіляючы толькі краёчак све славы (праз Анёлаў) убогім, чыстым душою пастушком, Найсьвяцейшай Родзіцы сваёй ды Апякуну.

Аднак здаровая інтуіцыя людзкая, ідучая дарогай Божага натхненьня, знайшла, пазнала Яго ды аддала Яму чэсьць і хвалу, аддала панаваньне на зямлі, як усёдзяржачаму Валадару. Тры мудрацы з Усходу з каралеўскай остэнтацыяй прыносяць Яму прывітальныя дарункі. Славім сяньня іх, як мудрых прадстаўнікоў усіх расаў, аддаючыхся пад Збавіцелеву ўладу.

Дарма бунтуюцца бязбожныя кароткагляды, дарма звоніць стальлю й зубамі трусьлівы распусны крывадушнік Гэрад над калыскай безбароннай учалавечанай жывой Праўды. Каляды ягоныя скончыліся беспаваротна. Насталі Каляды Хрыстовыя. Панаваньню іхняму ў душах людзкіх ніхто не паложыць канца.

Беларусь! У гістарычнай вясьне народаў дачакалася й Ты сваіх адраджэнскіх каляд... І над тваёй безбароннай калыскай стаіць, звонячы зубамі й стальлю, заханны люты людаед... І ты сьмяротна абвінавачана за тое толькі, што. ... жывеш ды што дзеці твае асьмеліліся «людзьмі звацца»...

Маці Беларусь! Уцьвярдзіся Сьвятам сёньняшнім у сваіх шляхотных ідэйных надзеях! Твая бо адраджэнская доля ў руках Таго, хто сказаў: «Я перамог сьвет»...

**З.**

## ДА ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ НА ЭМІГРАЦЫІ

**Дарагія Суродзічы ў Нямеччыне!**

**Колькі марак новымі грашыма ахвяравалі Вы ўжо на беларускіх студэнтаў?**

**Ці Вы ведаеце, што бяз Вашае дапамогі ня будзе ніводнага беларускага студэнта ў Нямеччыне?**

**Ці Вы знаеце, што беларускі студэнт — гэта Ваш сын, сваяк, сусед, абаронык Вашых справаў на эміграцыі, змагар за Вольную Бацькаўшчыну?**

**Ці Вы ведаеце, што калі-б ня было ані ў мінуўшчыне ані цяпер беларускай студыюючай моладзі, дык сьвет ня ведаў-бы аб нашым народзе й мы, як нацыя, ужо не існавалі-б?**

**Вашае становішча ёсьць вельмі цяжкае, Вы церпіце біду й нястачу. Але ці Вы ведаеце, як жыве беларускі студэнт? Шмат горш за Вас. Дзеля гэтага дапамажыце яму безадкладна!**

**Дарагія Суродзічы за межамі Нямеччыны!**

**У якой краіне сьвету Вы не знаходзіліся-б, у Аўстраліі, Афрыцы, Ангельшчыне, Швэцыі ці Амэрыцы, куды толькі ня кінуў Вас лёс, Вы жывіце ў непараўнальна лепшых умовах, чымсьці студэнты ДП. Ня будзьце глухімі на кліч беларускага студэнта, не закрывайце вачей на ягоную біду, ня дайце яму загінуць, дапамажыце яму!**

**Управа Студэнцкага Стыпэндыяльнага Фонду пры Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Чужыне кідае кліч: Беларусы! Бяз розьніцы на свае перакананьні ці партыйную прыналежнасьць — усе на дапамогу сваім студэнтам! Нехай ня будзе ніводнага Беларуса, які-б не ахвяраваў часткі свайго заробтку на ССФ!**

**Ахвяры просім прысылаць на адрас:**

**Vorstand CBSA**
**(16) Marburg/Lahn**
**Haspelstr. 4/II**
**US-Zone Germany.**

**Усе беларускія часапісы на эміграцыі просім гэты заклік перадрукаваць.**

**Управа ССФ пры ЦБСА.**

## СКОЛЬКІ ВЫЕХАЛА Ў ВЕРАСЬНІ?

У верасьні сёлета выехала ў краіны асяленьня роўна 21.034 ДП зь лягероў ІРО ў Нямеччыне, Аўстрыі й Італіі, у гэтым ліку было 1.810 рэпатрыянтаў, пераважна ў Польшчу. У паасобныя краіны з гэтага ліку выехала: у Канаду — 5.888, Палестыну — 3.811 (бяз помачы ІРО), у Вэнэцуэлю — 2.100, Францыю — 1.155, Аргентыну — 1.813, Аўстралію — 1.032, у Задзіночанае Каралеўства Вялікабрытаніі — 814 асобаў.

Ад ліпеня 1947 г. за пасярэдніцтвам ІРО ўжо перасялілася роўна 312.896 ДП, у гэтым ліку 57.117 рэпатрыявалася, а 177.847 выэміграваla пры поўнай помачы ІРО.

У лягерах ІРО пражывае яшчэ 519.980 ДП, а 555.300 карыстаецца апекаю ІРО. Спасярод 83.127 просьбаў аб помачы й апецы ІРО, што не дасюль не атрымлівалі, у той ці іншай форме ў верасьні атрымала гэтую помач 65.721 асоба.

## АБ БЕЛАРУСІ Ў ФРАНЦУСКАЙ МОВЕ

Перад некалькімі тыднямі выйшла ў Парыжы ў францускай мове інфармацыйная брашура аб Беларусі й беларусах («Беларусь» — Беларусь), старанна апрацаваная старшынёю Сусьветнага Аб'еднаньня Беларускае Эміграцыі, удзельніка Слуцкага Паўстаньня й францускай вызвольнай арміі інж. Л. Рыдлеўскага. У тэксьце брашуры, якая займае 40 бал. друку, знаходзім 5 гістарычных і этнагафічных картаў Беларусі, апрацаваных інж. В. Шыманцом.

Брашура выдадзена старанна і прыгожа й зьмяшчае ў сабе кароткія нарысы зь геаграфіі Беларусі, гісторыі Беларусі, але найбольш прысьвячае ўвагі гісторыі беларускага нацыянальна-вызвольнага руху й палітычнай дзейнасьці ўраду БНР. Брашура канчаецца трыма вельмі цэннымі дакумэнтамі, якімі зьяўляюцца: 1. Пісьмо прэзыдэнта БНР В. Захаркі да беларускае моладзі з 7.4.1942 г., у якім ён заклікае моладзь стойка змагацца за свае нацыянальна-дзяржаўныя ідэі супраць нямецкага акупанта, 2. Мэмарыял ураду БНР на мірную канфэрэнцыя ў Парыжы з 29 ліпеня 1946 г. 3. Пастанова сэсіі Рады БНР аб беларускай вонкавай палітыцы з 22.6.1948 г.

Выдадзеная брашура зьяўляецца вельмі важнай пазыцыяй у нашай палітычнай літаратуры ў чужых мовах. Яна выдатна прычыніцца да інфармацыі чужынцаў аб нашым народзе й ягоных нацыянальных імкненьнях ды станецца важным прапагандовым фактарам аб Беларусі ў шырокім сьвеце.

**(Ст.).**

## ПАЎСТАЛА СЛАВАЦКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РАДА

Коратка перад калядамі бягучага году паўстала на эміграцыі Славацкая Нацыянальная Рада, зложаная з цэлага раду славацкіх палітычных эмігрантаў розных кірункаў, і будучая вярхоўным органам у працы й змаганьні для славацкае дзяржавы.

На чале гэтае Рады стаіць, як ейны старшыня, былы міністар і пасол славацкае рэспублікі пры Ватыкане Кароль Сідор. Генэральным сакратаром зьяўляецца Пётр Прыдавок, які ад пачатку 1944 г., будучы старшынёю Славацкай Нацыянальнай Рады ў Лёндане, вёў змаганьне за захаваньне, а пазьней за аднаўленьне славацкае дзяржавы. Ад верасьня г.г., калі Славецкая Нацыянальная Рада ў Лёндане перафармавалася ў Славацкую Нацыянальную Раду на чужыне, удалося старшыні гэтае арганізацыі К. Сідору задзіночыць каля яе ўсе славакаў, прабываючых на эміграцыі.

Праграма Славацкай Нацыянальнай Рады на Чужыне высоўвае між іншымі наступныя аснаўныя заданьні:

1. Арганізацыя й кіраўніцтва працаю й змаганьнем славакаў на эміграцыі на баку заходніх альянтаў для:

а) Вызваленьня славакаў з пад камуністычнай дыктатуры і чэскага дзяржаўнага зьверхніцтва.

б) Стварэньня дэмакратычнай славацкай дзяржавы ў рамах этнаграфічных і гістарычных граніцаў Славаччыны.

в) Увядзеньня славакаў у якасьці роўнапраўных сяброў у міжнародныя арганізацыі.

г) Прыгатаўляньня культурнай, гаспадарскай, палітычнай і сацыяльнай адбудовы Славаччыны ў дэмакратычным духу.

2. Рэпрэзэнтацыя славацкага вызвольнага руху, эвэнтуальна іхных прадстаўнікоў ва ўрадах і розных органах іншых дзяржаваў, у міжнародных арганізацыях і рухах, як і ў цэнтральных органах эміграцыяў іншых народаў.

3. Грамадзкая праца для дабра славацкай эміграцыі ў сувязі з дзеючымі славацкімі арганізацыямі ў Амэрыцы й Канадзе, як і перад ІРО і іншымі арганізацыямі.

4. Паразумецца ў вадпаведным часе з усімі органамі, каторыя могуць забясьпечыць славацкае дзяржаўнае жыцьцё.

Падаючы для нашага грамадзянства гэтую вестку, мы, беларусы шчыра вітаем паўстаньне Славацкай Нацыянальнай Рады й жадаем ей і ўсяму братняму славацкаму народу посьпеху ў ягонай працы й змаганьні зс сваё поўнае вызваленьне й адбудову свае незалежнае дзяржавы.

## ЗА АБМЕЖАВАНЬНЕ ПРАВА ВЭТА

Палітычная камісія ЗН на паседжаньні 4 сьнежаня бальшынёю 33 супраць 6 галасоў і пры 4 устрымаўшыхся прыняла рэзалюцыю 4-ох вялікадзяржаваў (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі й Кітаю) ў справе абмежаваньня права вэта ў Радзе Бясьпечнасьці. Рэзалюцыя падае цэлы рад выпадкаў, у якіх гэтае права не павінна быць тарнаванае. Аднак савецкі дэлегат Вышынскі адкінуў гэтую прапазыцыю.

## ІТАЛІЯ СВАЕ ВАЕННЫЯ КАРАБЛІ ПЕРАДАЕ СССР

Італьянскі ўрад пастанавіў перадаць Савецкаму Саюзу свае ваенныя караблі, якія, згодна мірнаму дагавору, былі прыдзеленыя Савецкаму Саюзу ў лік ваенных рэпарацыяў.

— На 17 кангрэсе мадзярскіх прафэсыянальных саюзаў «аднагалосна» была прынятая рэзалюцыя, у якой называюць цяперашніх кіраўнікоў Югаславіі «зраднікамі на службе імпэрыялістых». Рэзалюцыя заклікае югаславянскі народ, каб ён зьліквідаваў Тыта зь ягонымі урадам і вярнуўся ў «лягер дэмакратычных народаў».

— Інданэзыйскія ўрадавыя войскі падчас бою забілі праўадыра камуністычных паўстанцаў Мусо, які пасьля 25-ці летняга прабываньня ў СССР вярнуўся ў гэтым годзе ў Інданэзію.

— Згодна паведамленьня іранскага генэральнага штабу, на іранска-савецкім пагранічча адбылася бойка паміж савецкімі й іранскімі войскамі. Былі забітыя й раненыя.

— Прэсавая служба нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі паведамляе, што за апошнія месяцы з савецкай зоны Нямеччыны ўцякло на Захад каля 10.000 савецкіх дызэртыраў, у тым ліку 25 генэралаў.

— Сьнежная завея, якая прайшла з поўначы цераз Турцыю, 14 лістапада перарвала плаваньне караблёў на Чорным моры. У гэты-ж дзень выпаў ў сталіцы Турцыі — Анкары першы сьнег.

**Выэміграваўшы зь Нямеччыны, першым Тваім абвязкам ёсьць навязаньне сувязі з нашай рэдакцыяй і запрануманьне Твае адзінае вернае спадарожніцы ў чужой краіне — «Бацькаўшчыны».**

# Зь Беларускага Жыцьця

## ПЕРАМОГА ЗА НАМІ

**(Ад собскага карэспандэнта з Мэнхэгофу)**

Выступленьне Болдырава ў Амэрыцы прыпомніла лішні раз жыхаром лягеру Мэнхэгоф гэтага расейскага авантурніка, які ў сваім часе арганізаваў «трудовой лагерь» у Мэнхэгофе, дзе быў заведзены бальшавіцкі прыгон, паліцыйны тэрор і бюрократыя, а ў нацыянальным сэнсе расейская «ураўнілаўка» згодна слоў «кітайцы — те-ж русскіе, только окітайченые».

Хто такі Болдыраў і што такое прадстаўляе партыя НТС ці інакш салідарыстыя, старыя жыхары лягеру балюча пераканаліся на сваёй скуры. Сэнсацыяй для іх ёсьць толькі тое, што быццам НТС існуе ўжо 18 гадоў, ды ў прыдатак кіруе рэвалюцыйным рухам у Расеі. Бальшыня людзей даведалася аб існаваньні салідарыстых толькі на эміграцыі, або толькі ў лягеры Мэнхэгоф, які ў свой час быў гняздом тэтых белых бальшавікоў. Чалавек, які пазнаёміцца з праграмай салідарыстых, інакш іх не ахрысьціць, як толькі гэтымі словамі.

Салідарыстыя зарганізавалі сваю НТС на эміграцыі (перадусім у Югаславіі) ў часе і на ўзор модных тады таталітарных рухаў: фашызму, гітлерызму і іншых ізмаў. Цяпер, ня глядзячы на тое, што яны аджылі свой век і ўвесь сьвет з жахам і ненавісьцю адносіцца да усякіх таталітарызмаў, рыхтуючыся зьліквідаваць апошні чырвоны таталітарызм, як крыніцу найгоршае тыраніі, салідарыстыя ня толькі не перагледзелі свае праграмы і не разьвязаліся, а наадварот — стараюцца і надалей муціць мазгі сваёй таталітарнай праграмай. А гэта таму, што яны — чыста эмігранцкі вытвар, ня маюць ніякага апірышча на бацькаўшчыне і ня здолеюць здабыць яго дэмакратычным спосабам сярод масаў новае расейскае эміграцыі. Яны думаюць старымі белагвардзейскімі катэгорыямі, ня здольныя зразумець духу часу і прадстаўляюць зь сябе сапраўдныя «музейные древності».

Разважаючы праграму салідарыстых, адзін польскі публіцысты правільна рэзюмуе: «Гэткая будоўля мусіць сваёй канструкцыяй мала што зацікавіць, але проста занепакоіць нятолькі народы, уваходзячыя ў склад сучаснай «чырвонай імпэрыі», нятолькі народы «сатэлітныя», але перадусім увесь Захад. Бо зьдзейсьненьне гэтай канцэпцыі бяз пагляду на час выкананьня, зьменіць толькі назоў і можа коляр шыльды, але не адхіліць зусім пагрозы, гадаванай на Крамлі ад шмат пакаленьняў, заўсёды прагавітага, заўсёды кансэквэнтнага і заўсёды ненасытнага захопніцтва» (Т. Конашэвіч у «ДП Экспрэсе» № 14 з 17.4.1948).

Беларусы першыя пераканалі жыхароў лягеру Мэхэнгоф, што салідаррыстыя, як і ўсякія іншыя бальшавікі, не прадстаўляюць зь сябе сапраўднае сілы, бо не абапіраюцца на народнай волі, а кіруюцца выключна гвалтам, нахабствам і ашуканствам. У лягеры Мэхэгоф яны ніколі ня мелі больш за пару дзесяткаў сяброў сваей партыі, але прадстаўлялі да часу зьяўленьня беларусаў адзіную зарганізаваную групу, якая ад пачатку захапіла ў свае рукі адміністрацыйны апарат. Бяручы пад увагу бясхрыбетнасьць наяўнае тут інтэлігэнцыі й запалоханасьць простых людзей, у бальшыні сваёй уцёкшых з «чырвонага раю», стане ясным, чаму салідарыстыя маглі так доўга, бо аж да сёлетніх лягерных выбараў, утрымоўвацца пры ўладзе. Беларусы першыя нанесьлі рашучы ўдар на салідарыстых падчас лягерных выбараў у канцы леташняга году. Тады, зь ініцыятывы беларусаў паўстаў ў лягеры Міжнацыянальны Выбарны Блёк, у які ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх большых нацыянальных групаў лягеру, як: беларусаў, расейцаў, украінцаў і палякаў. Улічваючы свой правал, салідарыстыя зацягнулі выбары на некалькі месяцаў, каб у міжчасе пазбыцца зь лягеру палякаў і аслабіць найсільнейшую ў арганізацыйным і ідэёвым сэнсе беларускую групу. Нажаль, знайшлося сярод беларусаў некалькі прадажных адзінак, якія пайшлі на ўслугі салідарыстых і зламалі супольны антысалідарысцкі фронт. Карыстаючы з гэтага, салідарыстыя, як рыба, якая з галавы гніе, але хвастом яшчэ боўтае, пачалі тарнаваць тэрор. Беларусам адабралі памешканьне для школы і дзяцячага садка, пазбавілі беларускіх вучыцялёў дадатковых рацыёнаў і г. д. Гэта аднак беларусаў не запалохала. Школьны год, хоць і зь цяжкасьцямі, быў закончаны і беларусы ўтрымалі сваю незалежную пазыцыю ў лягеры.

Між іншым трэба адцеміць намаганьні салідарыстых абдурыць і зьвесьці зь незалежніцкага шляху беларускую моладзь, якую замаскованае салідарысцкае кіраўніцтва мясцовай ІМКА старалася ў свой час прыцягнуць да сябе і з гэтай мэтай пачало нат выдаваць ратахтарны часапіс «Единство», дзе зьмяшчаліся літаратурныя перадрукі зь беларускіх газэт. Нахабства салідарыстых дайшло да таго, што кіраўнік тутэйшых «российскіх разведчіков» — салідарысты Полчанінов пачаў забіраць сабе пошту, кірованую на адрас Беларускіх Скаўтаў у Мэнхэгофе, тлумачучыся тым, што сярод ягоных «разведчіков», якіх клічам ёсьць: «Будь готов за Россію», быццам знаходзяцца й беларусы.

Апошнім трыкам салідарыстых было зарганізаваньне імі г. зв. Беларускага Дэмакратычнага Камітэту, які зь першых дзён цярпеў на малакроўе, а цяпер зусім разваліўся, бо нялічныя беларусы, якія туды ўпісаліся, цяпер ад яго адыйшлі, а расейцы, якія былі на яго чале, уступілі як адзін у «Комітет Россійской Эміграціі в Касселе і Менхегофе».

Ня глядзячы на ўсе свае натугі, разваліць беларускае грамадзтва ў Мэнхэгофе салідарыстым не ўдалося. Беларуская школа ў лягеры Мэнхэгоф працуе сёлета ад пачатку школьнага году і, хоць із спазьненьнем, але атрымала назад сваё леташняе памешканьне ад новага кіраўніцтва лягеру. Дня 28 лістапада сёлета Беларускі Камітэт зладзіў урачыстае сьвяткаваньне ўгодкаў Слуцкага Паўстаньня. Была адслужана паніхіда ў лягернай царкве, а ўвечары прачытаны прынагодны рэфэрат. Непадкупныя і поўныя годнасьці паводзіны арганізованага беларускага грамадзтва заваявалі яму сымпатыі сярод іншых жыхароў лягеру, а нясьведамыя ці запалоханыя дагэтуль беларусы што-раз часьцей зьвяртаюцца ў Беларускі Камітэт за парадай і падтрымкай.

**Ч.**

### МЮНХЭНСКІЯ СТУДЭНТЫ НА СТАРОЖЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДЗІнСТВА

Ад часу зачыненьня ўнівэрсытэту — УНРРА Мюнхенскае Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне вядзе цяжкае існаваньне. Недахоп собскага памешканьня, вялікая расьцярушанасьць студэнтаў і выключна цяжкія матарыяльныя абставіны жыцьця ставяць арганізацыю перад цяжкім выпрабаваньнем. Гэтае крытычнае становішча БСЗ — Мюнхэн пастанавілі выкарыстаць некалькі «палітыкантаў», каб уцягнуць студэнтаў ў цёмную палітычную работу й упрагчы арганізацыю ў чужыя аглоблі. Гора-палітыкі гэтыя павялі ліхарадкавую кампанію за «пераняцьце ўлады» ў БСЗ, пасунуўшыся аж да ўкладаньня лісты «новага ўраду»... Але беларускае студэнцтва аказалася дастаткова выробленым, каб вычуць ува ўсім гэтым скрытую разбуральную акцыю з пад вядомага знаку.

На гадавым звычайным сходзе Згуртаваньня 11 сьнежаня сёлета сяброўкі й сябры далі станоўкі адпор ганебным спробам разьбіцьця адзінства нашае студэнцкае грамады, якая ў цяжкім змаганьні зь лёсам стаіць непахісна на беларускіх нацыянальна-адраджэнскіх пазыцыях і гэтым кантынуе традыцыі беларускага студэнцтва, якое з самага пачатку нашага адраджэньня было ягоным авангардам і кузьняю маладых нацыянальна-дынамічных кадраў руху.

За старшыню БСЗ быў перавыбраны дасюлешні старшыня А. Бяленіс. Былі прынятыя ў арганізацыю новыя беларускія студэнты й адкінуты заявы тых студэнтаў, якія, належачы да чужанацыянальных акадэміцкіх арганізацыяў, зажадалі ўступіць ў БСЗ зь відавочнай мэтай падтрымліваньня палітычна-дывэрсыйнай акцыі сярод студэнцтва.

На сходзе прысутнічалі два прадстаўнікі ўраду Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на чужыне. Адзін зь іх, старшыня Студэнцкага Стыпэндыяльнага Фонду др. Г. даў прысутным кароткую інфармацыю аб важнай ў сяньняшні крытычны час дапамаговай дзейнасьці ССФ.

**П. Лубяга.**

### ДЭМАНСТРАЦЫЯ ВОЛЬНЫХ СТУДЭНТАЎ СУПРАЦЬ ЧЫРВОНАГА ТЭРОРУ

17 лістапада сёлета адбыўся ў Лёндане вялікі мітынг вольных студэнтаў паняволеных бальшавізмам народаў. Мітынг быў наладжаны чэскай студэнцкай арганізацыяй у сувязі з прыпадаючай на гэты дзень гадавінаю сьмерці 9-ці чэскіх студэнтаў падчас заняцьця Чэхаславаччыны Гітлерам. Апрача чэхаў у мітынгу прынялі ўдзел прадстаўнікі студэнтаў наступных нацыянальнасьцяў: альбанскай, беларускай, эстонскай, харвацкай, летувіскай, латыскай, польскай, румынскай, сэрбскай, славацкай, славэнскай, украінскай, мадзярскай.

На мітынгу сказала вялікую прамову княгіня Атоль — кіраўнічка Ангельскай Лігі для захаваньня эўрапэйскай вольнасьці й рэпрэзэнтантка ангельскіх студэнцкіх арганізацыяў. Яна падкрэсьліла супольнасьць ідэалаў вольнасьці паміж народамі, зьвяртаючы ўвагу на тую небясьпеку, заграждаючую вольнасьці, якую прадстаўляе сабою камуністычны таталітарызм. Потым яна выказала патрэбу актыўнасьці замежных студэнтаў у дапамозе ангельцам супрацьставіцца камуністычнай акцыі. Прадстаўнік Чэскай Нацыянальнай Рады ген. Прхаля ўспомніў аб капітуляцыі чэскага ўраду перад нямецкай агрэсыяй. Акт 9-цёх чэскіх студэнтаў прадставіў як прыклад волі ўсяго народу, ня гледзячы на капітуляцыйную палітыку свайго ўраду.

Беларусаў рэпрэзэнтавала на мітынгу мясцовая група Беларускага Хрысьціянскага Акадэміцкага Аб'яднаньня «Жыцьцё». Ад імя беларускіх студэнтаў меў прамову сп. Я. Амор, які коратка насьветліў прабег змаганьня беларускага народу за сваю свабоду. Характарызуючы бальшавізм, як найбольшага ворага беларускага народу, ён выказаў бальшавіцкія акты тэрору ў нішчэньні беларускае інтэлігенцыі. Ён выказаў спачуваньне беларускіх студэнтаў для змаганьня чэхаў за сваю вольнасьць. «Чэскае змаганьне за вольнасьць зьяўляецца вельмі блізкае сэрцу беларусаў, так як многія нашыя правадыры знаходзілі ў Празе палітычны азыль ад перасьледваньняў так у Ўсходняй Беларусі, як і ў Заходняй, а нашыя студэнты здабывалі там навуку й атрымлівалі матарыяльную помач»... У далейшым ён прадставіў трагэдыю Беларусі ў часы масавага нішчэньня бальшавікамі беларускага народу. Прэлегэнт зьвярнуў увагу на стойкасьць беларускага незалежніцкага руху й ягоную сучасную актыўнасьць на эміграцыі. Ён закончыў славамі: «Мы, рэпрэзэнтанты вольнага маладога беларускага пакаленьня, далей прадаўжаем сьвятую для нашага краю справу змаганьня за незалежнасьць, за якую гінулі тысячы нашых патрыётаў. Супольна з заходнімі дэмакратыямі й іншымі, паняволенымі чырвоным таталітарызмам народамі сярэдняй і ўсходняй Эўропы мы, беларусы, высака нясём сьцяг змаганьня за вольнасьць і дэмакратыю».

Ангельская й іншыя прэсы пасьвяцілі на сваіх балонах шмат месца гэтаму мітынгу, а радыё ВВС, цытуючы некаторыя прамовы, гадавіну сьмерці 9-ёх чэскіх студэнтаў прадставіла, як Дзень Студэнта, у якім прадстаўнікі моладзі паняволеных народаў горача дэманстравалі сваю волю і гатовасьць змагацца супраць таталітарнага гвалту.

**(З часапісу «Беларус на Чужыне).**

### ПРА ДОЛЮ АДЗІНОТНЫХ НА ЭМІГРАЦЫІ

Дзяцюкі (знач. нежанатыя) і дзяўчаты, што, здавалася-б найшчасьліўшыя з паміж высяленцаў, бо лёгка могуць эміграваць, аказуюцца ў небясьпечнасьці. Калі яны выедуць із сваіх асяродкаў у Нямеччыне нежанатымі або незамужнімі, дык у новых краёх асяленьня або наагул ня змогуць пабрацца, і ім будзе пагражаць дэмаралізацыя, або пабяруцца з чужнікамі, і чакае такіх звычайна няшчасная доля: у вабодвых прыпадках такая моладзь зьгіне для свайго народу. Дзеля таго трэба зрабіць усё чыста, каб пабрацца із сваймі яшчэ перад эміграваньнем тут у Нямеччыне. Калі зьвернем увагу, што ў нас дзяўчат шмат меней, як дзяцюкоў, дык асабліва шкада, калі хоць адна дзяўчына будзе страчана менаваным парадкам.

У ўкраінцаў паўстала вельмі паважная арганізацыя, складзеная з прадстаўнікоў цэнтральных украінскіх арганізацыяў і прадстаўнікоў абедзьвюх — праваслаўнай і вуніяцкай украінскіх цэркваў, заданьні якой гэткія: а) усьведамляць украінскае грамадзтва пра значаньне сям'і у ўмовах эміграцыі, як дзеля жыцьця асабістага, так і дзеля народу; б) прапагаваць захаваньне ўкраінскага характару сям'і, пабудаванай на прынцыпах хрысціянскай маральнасьці й этыкі; в) выясьняць адзінотным цяжкасьці закладаньня ўкраінскіх сем'яў у эміграцыйным расьцярушаньні; г) агітаваць за ажаненьне і выхад замуж перад выездам на месца новага асяленьня; д) прыяць і памагаць пабраньню паміж сваймі.

З прыемнасьцю мусім адзначыць, што гэткае пастаўленьне справы сярод украінскае эміграцыі сьветчыць пра яе грамадзка-нацыянальную сьпеласьць.

Вылічаныя патрэбы ўкраінскія ў большай меры могуць быць прытарнаваныя да нас беларусаў. Дзеля таго мы пявінны на іх зьвярнуць вялікую ўвагу.

**Я. Ст.**

### ВЫЯСЬНЕНЬНЕ РЭДАКЦЫІ

Рэдакцыя роўна перад двумя тыднямі атрымала ад каменданта беларускага лягеру АБЦ у Ватэнштэце (ангельская зона) С. Каўша спраставаньне на надрукованую ў № 38(41) за 28.11.48 г. «Бацькаўшчыны» карэспандэнцыю з Ватэнштэту «Як загінуў Ільяшэвіч?» з дамаганьнем надрукаваньня яе ў найбліжэйшым нумары нашае газэты пад пагрозаю скіраваньня справы ў суд. Перад тым аднак, чымсьці гэтае спраставаньне надрукаваць, копія яго была намі перасланая аўтарытэтным беларусам у Ватэнштэце з просьбаю праверкі праўдзівасьці пададзеных ў ім фактаў. Адказ на гэта мы атрымалі перад пару днямі, зь якога выясьнілася, што некаторыя факты, пададзеныя ў карэспандэнцыі, былі непраўдзівымі, але й некаторыя факты, пададзеныя ў спраставаньні Каўша, былі таксама фальшывыя. Ня гледзячы аднак на гэта, спраставаньне Каўша мела быць надрукаванае ўжо ў гэтым нумары «Бацькаўшчыны». Тымчасам сяньня мы даведаліся, што гэтае сваё спраставаньне, з даданьнем да яго ўсякай непрызваітай лаянкі, Коўш размножыў на ратататары й разаслаў па ўсей Нямеччыне. У сувязі з гэтым друкаваць ягонае спраставаньне ўважаем ужо за непатрэбнае, так як, не чакаючы на надрукаваньне яго ў газэце й не пастараўшыся выясьніць, ці будзе яно зьменшчана, ці не, выручыў нас у гэтым сам Коўш.

На закід Каўша, што надрукаваньне ўспомненай карэспандэнцыі было «спробай сьвядома апляваць імя чалавека, які ўсё сваё жыцьце служыў беларускаму народу», выясьняем, што, друкуючы гэную карэспандэнцыю, мы былі далёкімі навет ад самой думкі, каб зьняважыць памяць нябожчыка. Наадварот, мы хацелі толькі зьвярнуць увагу на тыя адносіны й умовы жыцьця ў лягеры Ватэнштэт, якія маглі стацца пасрэднай прычынай сьмерці Ільяшэвіча й згінуўшых зь ім разам іншых людзей. Свае-ж адносіны да памёршага мы выказалі ў нэкралёгу, надрукованым у № 37(40) «Бацькаўшчыны».

### ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ГАЛОЎНАЙ УПРАВЫ ЗГУРТАВАНЬНЯ БЕЛАРУСАЎ У АРГЕНТЫНЕ

Галоўная Управа Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне ветліва паведамляе ўсіх тых, што зложылі заявы індывідуальна або запісаліся на сьпіскі, з просьбай дастаньня ім дазволу уезду ў Аргентыну, наступнае:

Аргентынскі Урад ад дня 17 верасьня 1948 году ўстрымаў часова выдачу дазволу уезду ў Аргентыну для ўсіх нацыянальнасьцяў за выключэньнем італьянцаў і гішпанцаў.

Управа ЗБА, як і другія нацыянальныя камітэты, стараецца рабіць усё магчымае, каб ізноў даставаць дазволы. Аргентынскія Эміграцыйныя Ўлады запэўняюць, што посьле Новага Году пачнуць ізноў зацьвярджаць сьпіскі, належна аформленыя й пацьверджаныя Нацыянальнымі Камітэтамі, аднак не падаюць даты распачацьця падпісваньня.

Каб паінфармаваць заінтарасаваных аб ходзе справы й каб не даваць кажнаму ў паасобку лістоўных адказаў і інфармацыяў, Галоўная Ўправа ЗБА падае да ведама, што:

1. Сьпісак на 31 асобу (пераважна заявы паасобныя) высланы на зацьверджаньне ў Эміграцыйнае Бюро 11.8.1948, які да сяньня там яшчэ знаходзіцца.
2. Сьпісак на 32 асобы (сьпісак лягеру Остэргофэн зацьв. БЦК 18.8.48) ,высланы на зацьверджаньне Упpавай ЗБА ў Эміграцыйнае Бюро 6.9.48, які таксама чакае зацьверджаньня.
3. Сьпісак на 195 асоб (сьпісак з лягеру Міхэльсдорф зацьв. БЦК і перасланы др. А. Орсам), высланы Управай ЗБА ў Эміграцыйнае Бюро на зацьверджаньне 4.10.1948, які спаткаў лёс папярэдніх. (Тут уключаны сьпісак з Фр. Зоны, перасланы др. Войтэнкам).

Сьпіскі, якія знаходзяцца ў канцылярыі ЗБА й ня будуць высланыя, пакуль ня будуць зацьверджаныя папярэднія:

1. Сьпісак артыстых, лягеру Міхэльсдорф на 21 асобаў, зацьверджаны БЦК у Нямеччыне дня 20.10.1948.
2. Сьпісак зь лягеру Мэнхэгоф на 25 асобаў, зацьверджаны БЦК ў Нямеччыне дня 1.10.1948.
3. Сьпісак зь лягеру Остэргофэн на 38 асобаў, зацьверджаны БЦК ў Нямеччыне 1.10.1948.
4. Дадатковы сьпісак Камітэту Вялікай Гэсыі на 20 асоб, зацьверджаны 24.10.1948 (перасланы інж. Ханяўкам).
5. Сьпісак з Аўстрыі на 24 асобы, прысланы сп. А. Кадняком з дня 4.11.1948.
6. Сьпісак з Аўстрыі на 58 асоб, зацьверджаны БЦК ў Нямеччыне дня 18.11.1948.

**Управа ЗБА.**

Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, могуць выражаць пагляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.

**Whiteruthenian Weekly „The Fatherland"**
Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division 20 July 48, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies.
Administration: (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian, D.P.Camp.
Licensee: Wladimir Bortnik.
Edited by: Whiteruthenian National Commitee.
Printed by: Georg Jakob, München 8, Pütrichstraße 8a.